Пралетарыі усіх краёў, злучайцеся.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

Штодзённая газэта.

Адрас рэдакцыі й адміністрацыі:
Мінск, Пэтрапаўлаўская № 6
пры Госіздаце.

Прыймаюцца ўсякія бесплатныя абвяшчэньні, якія маюць дачыненьне да Савецкай Беларусі. На прыватныя абвяшчэньні ўстановіцца кантракт.

ДРУГІ ГОД ВЫДАНЬНЯ

ВЫДАНЬНЕ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ.

№ 206 (316) Пятніца, 16-га верасьня 1921 г.

На новы шлях.

Адначасна з іншымі атрадамі рабочага класу Беларусі і працоўнікі асьветы зьбіраюцца зараз на свае прафэсыянальныя праізводзтвенныя канфэрэнцыі дзеля таго, каб падлічыць сваю працу, направіць памылкі і намеціць вехі прадстаячага шляху. У адзнаку ад усіх іншых праізводзтвеных Саюзаў, Саюз працаўнікоў асьветы на Беларусі мае свае спэцыяльныя і вельмі цяжкія заданьні. Перш за ўсё трэба узмацніць і канчаткова аформіць палітычны напрамак Саюзу.

Працэс гэтай, у адзнаку ад іншых Саюзаў, крыху зацягнуўся, на што, разумеецца, маюцца свае прычыны.

Рожнакалёрнасьць складу ў нацыянальным сэнсе, раскіданасьць невялікімі ячэйкамі, адарванасьць фізычна ад індустрыяльных ячэек фабрык і заводаў — усё гэта ўзлажнілася яшчэ тым, што большасьці членаў Саюзу прыходзіцца разьвівацца і жыць у вельмі цяжкіх варунках — матэрыяльных і маральных.

Настаўніх на вёсцы, як адзіны прадстаўнік пралетарыяту, знаходзіцца між молатам і каўдлам. З аднаго боку яго цісьне старая клерыкальная Расея — у асобе духавенства і традыцыі старой царкоўна-манархічнай школы, з другога боку яго цісьне мелка-буржуйная яшчэ цёмная і несьвядомая вёска з яе старажытнымі патрыархальнымі звычаямі, з забабонамі. І на дзіва, калі з прычыны гэтых вельмі шкодных варункаў Саюз працаўнікоў асьветы разьвіваецца і ідзе наперад на хуткім кроку.

Але ўсё-такі, дзякуючы таму, што Саюз складаецца ў сваей большасьці са здаровых элементаў, якія выйшлі з сялянскай і рабочай сям'і, працэс паступацельнага руху Саюзу наперад ідзе цьвёрдымі крокамі.

Асабліва ж з пераменай эканамічнай палітыкі, у зьвязку з тым, што Саюз, як арган завадная пралетарская сіла, пачынае прыцягвацца да выказаньня важнейшых дзяржаўных кампаніяў (агіткампаніі па барацьбе з бандытызмам і харчовага налогу). У зьвязку з гэтым, Саюз працаўнікоў асьветы ня толькі ўзмацняецца, але і здабывае ў нашым гаспадарчым і палітычным жыцьці першае месца. Настаўнік становіцца ня толькі разсаднікам граматнасьці, сьпецам, але і прадстаўнікам пралетарыяту на вёсцы, яго пасрэднікам між сялянствам і рабочым клясам гораду. Ён становіцца і харчовым працаўніком і палітычным, і наогул тым брадзілам пралетарскай дыктатуры, праз якога мацнее яна і разьвіваецца ў глыбіню і ў шырыню. Гэта галоўная асаблівасьць нядаўняга моманту ў разьвіцьці Саюзу працаўнікоў асьветы.

Але ёсьць і яшчэ адна вельмі цікавая і гістарычна важная місія, якую прыдзецца выпаўніць працаўнікам асьветы Беларусі, місія, якая непасрэдна зьвязана з яго праізводзтвам. Місія гэта заключаецца з тым, што наша школа, якая ў сваім самым рашучым чынам пераарганізавана са старой манархічна клерыкальна-русыфікатарскай у школу блізкую нашаму народу, у працоўную беларускую школу. Гэта місія ўскладвае на нас найвялікшую адказнасьць за лёс будучых пакаленьняў, — і да вырашэньня гэтага цяжкага і неадкладнага заданьня працаўнікі асьветы павінны прыступіць зараз жа.

Паведамленьні са Слуцку, Ігумена, дзе ўжо закончыліся павятовыя канфэрэнцыі, дзе гэта пытаньне было пастаўлена і правідлова вырашана, даюць нам бадзёрасьці і веры ў вялікую сілу і здароўе настаўніцкіх мас, якія дружна сталі ў рады пралетарыяту і выпаўняюць заданьні рабочага класу і рэвалюцыі на вёсцы.

Мы пэўны, што і Менская павятова-гарадзкая канфэрэнцыя працоўнікаў асьветы, якая ўчора адчыніла сваю працу, справіцца гэтак сама ўсьпешна са сваімі заданьнямі і прыблізіць гадзіну нашай канчатковай пабеды над цемрай і ўсімі рэшткамі старых аджыўшых парадкаў.

У панскай Польшчы.

ПАРЫЖ 13. 9. „Юманітэ" паведамляе аб ваенных падгатаўленьнях супроць Савецкай улады. У Варшаве 100 францускіх афіцэраў саставляюць плян наступленьня. Арсэнал у Гарбе выробляе тысячу кулямётаў. У Гранове ваенныя заводы так сама заняты вырабам снарадаў.

Што чуваць заграніцай.

Крызыс ангельскай прамысловасьці.

Ангельскай хлапчатна-папяровай прамысловасьці пагражае крызыс. Рабочыя патрабуюць плату за час забастоўкі. Прадпрыемцы пагражаюць сваей забастоўкай у выпадку калі рабочыя абвясьцяць забастоўку.

Манархічная агітацыя.

Газэта „Пражская Трыбуна" паведамляе, што прадстаўнікі вэнгерскай і аўстрыйскай арыстакрацыі ў Жэневе пашыраюць моцную агітацыю, маючую мэтай узварот Габсбургаў на вэнгерскі прастол. Яны маюць замеры зрабіць у Вэнгрыі галасаваньне пад паглядам лігі нацыяў.

Перад скліканьнем лігі нацыяў.

З Варшавы тэлеграфуюць, што скліканьне савету лігі нацыяў назначана на 29-га верасьня. Верхня-Сілеская камісія будзе выклікана ў першых лічбах кастрычніка для перадачы спраў Савету лігі нацыяў.

Камуністы у Празе.

11-га верасьня ў Празе адбылася вялікая маніфэстацыя камуністаў пад лёзунгам адмены платы за зямлю.

Дзеле чаго?

Па паведамленьню з Варшавы, польскае агэнства паведаміла аб маючым прыбыцьці ў Данцыг францускай эскадры.

Авантурнікі.

ЛЁНДАН, 13—IX. Ангельскія газэты ў зьвязку са здараньнямі ў Нямеччыне вымагаюць сахраненьня пяперашняга правіцельства і недапушчэньня да ўлады партыяў, віноўных у вайне.

Капітал працуе.

ПАРЫЖ, 13—IX. 200 амэрыканскіх чыгуначных вобчастваў запатрабавалі адмены васьмі гадзіннага рабочага дня на чыгунках і ўвядзеньня зноў дзесяцігадзіннага.

Нікуды ня годныя.

ЛІЁН, 13—IX. Бразілія адмовілася прыняць другую партыю урангэлеўскіх уцекачоў у 600 чалавек, бо яны ня годны да земляробнай працы. Яны зьвернуты ў Турэччыну.

Забараняюць.

У Гэльсінгфорсе абвешчан загад супроць чырвоных арганізацыяў. Забараняюцца рабочыя арганізацыі, дэманстрацыі, выхад камуністычных газэт.

Аб школах на Беларусі.

Частае вучэбны год і кожны настаўнік мусіць добра падумаць: з чым ён увойдзе ў школу, які навуковы скарб ён увасьцьць у школу дзеле перадачы яго дзецям, якія ужо ў будучыне павінны быць не калекамі, ня вычурнымі, а шчырымі істнымі грамадзянамі ў будоўлі нашай дарагой бацькаўшчыны.

Мы цяпер павінны ўсе свае сілы, ўсю моц накіраваць на тое, каб маладое пакаленьне канчатково прабудзілася ад таго сну, у якім становішчы знаходзіцца цяпер амаль ня ўсё сялянства.

Мы ўжо не павінны сумлявацца сваей мовы, мы павінны яе ўжываць в цыхай, што яна наша старадаўная, якой гаварылі нашы дзяды, якая ня страцілася праз колькі сот гадоў, ня гледзячы на страшэнныя ўціскі з боку царскай улады. І калі наша мова перажыла гэткі шматвяковы этап, калі яна да гэтуль ня страцілася, дык мусіць у ёй ёсьць якаясь моц, характэр, пекнасьць; а што гэта так, дык здзецца можны настаўнік павінен прымкнуць гэта ў школе на дзецях. Колькі яны ня вучацца па расейскіх падручніках, колькі ня мушчуюць іх настаўнікі гаварыць парасейску, мідне яшчэ не дабіліся, каб дзеці расейскіх школ у нас на Беларусі гаварылі парасейску.

Дык нехай жа кожны настаўнік, перад тым, як увайсьці ў школу, падумае аб гэтым, нехай не калечыць дзецей чужой мовай, бо калі цяпер распаўсюджваюцца беларускія кнігі, зьяўляецца шмат навуковых кніг на беларускай мове, дык трэба, каб дзеці добра ведалі як чытаць, дык і пісаць па-беларуску; трэба, каб быў усюды адна літэратурная беларуская мова як гэта ёсьць і ўсюды, ня гледзячы на розныя провінцыялізмы ў кожнай мове.

Што-ж датычыцца да таго, быццам беларуская мова страціла ўжо сваю вартасьць, быццам сядзяе на хочуць, каб дзеці ўжывалі яе ў школах, дык нехай гэту дурасьць выкінуць з галавы тыя настаўнікі, ў якіх яна ідзе, бо гэтага нігдзе няма; ні вольнае селяніна ня чураецца сваёй мовы, а калі гдзе й знойдуцца такія, што хочуць, каб вучылі ў школах парасейску, дык гэта дзеле таго, што яны яшчэ не верыць, што навука можа вяцадзецца на іх роднай мове, што іхнае дзіця, атрымаўшае навуку на роднай мове, пойдзе ў людзі, а тым болей, калі настаўнікі яшчэ кпяць з беларускай мовы; ад веку наш сялянін гаўтаў шыю ад уціску і ў гэтым разе ён пакараецца думкам свайго настаўніка ці іншага інтэлігента, выражэнагася сваёй роднай мовы, на якой ён гаварыў з маленства.

Настаўнікі, памятайце, што беларуская культурна-асьветная праца пашла пашыраючыся ўпарод, ужо яе ня спыніць. Раз дзіця навучыцца чытаць пабеларуску, раз яно навучыцца колькі вершаў беларускіх, ужо яму мейсца расейскім кнігам, — аб гэтым сьведчаць тыя настаўнікі, якія спачатку былі працоўнікамі беларускай мовы ў школе; дык вучыце іх на тых кніжках, якія напісаны на іх роднай мове.

Тауро.

Гандлевыя справы.

Расейскае судно

У Петраград вярнулася з Нямеччыны судно расейскага вобчества Чырвонага крыжу „Трансваль“ з 740 расейскімі ваенна-палоннымі.

„Трансваль“ прывёз 720 тонн сельска-гаспадарчых машын. У працягу ўсей зімы будуць прыбываць праз Петраградзкі порт заграніччныя паравозы. Дзеля гэтага прыводзяцца ў парадак ледаколы.

Прывоз тавараў.

Начальнік Балтыцкага парта ага Упраўленьня Народнага Камісарыяту, Прыказанага гандлю п. ведамій: куплены заграніцай значны лік вугольля, якое кожны дзень падвозіцца ў Петраград. У бліжэйшыя тыдні чакаецца значны лік чыгуначных рэчаў абсталяваньня. Зробленыя ў Швэцыі цягнікі прышлі. На працягу верасьня беспер станку прывозіцца купленыя намі раней электрычныя прыборы дзеле абсталяваньня Кашырскай, Шатурскай і інш. электрычных станцыяў. У бліжэйшыя тыдні можна чакаць падвозу яшчэ значнай часткі электрычных рэчаў. З харчоў атрымана фасоль бабы і тлустасьць. Убліжэйшыя часы мы будзем атрымліваць хлеб, мясо і селядцы. Закупка селядцоў дабываецца дужа ўдачна. Яны абойдуцца танней за каштоўнасьць іх у цяперашнім часе. Трэба яшчэ дзначыць на закупку хлеба ў партоў Персіі, першыя партыі якога павінны прысьці ў гэткім часе. Так сама на закупку тавараў, якія знаходзяцца ў партох Персіі. Дзеле наладжаньня тавараменнай справы з Чэхаславакіяй і Баўгарыяй камандыраваны чэхі—славацкія і ўкраінскія дэлегацыі ў Прагу. Там выявіцца пытаньне аб закупцы цэлага раду тавараў. Імпортны аддзел Народнага Камісарыяту заграніччнага гандлю зробіў вялікую падрыхтоўчую працу па адпраўцы дэлегацыі ў Баўгарыю, каторая павінна абгледзіць рэйны і выявіць становішча, якое досіць дорае для Расеі. Дэлегацыі даручана купіць і адправіць некаторы лік харчоў у Данецкі басэйн.

Дапамога галадуючым.

Дапамога будзе.

ЛЕНДАН. 14. 9. Адор заявіў на пасяджэньні Лігі Нацыяў у Жэневе, што згода, зробленая Нансенам з Савецкім урадам, забясьпечваецца добрым кантролем дапамогі, якая будзе зроблена галадуючымад ведароду. Таварыства Чырвонага крыжа можа прыняць удзел у гэтай справе.

Аказаньне Ургарду.

Аказаньні грамадзянін Ургард заверавай камісіі дапамогі галадуючым пры Усерасейскім Цэнтральным Выканаўчым Камітэце 120 мілёнаў рублёў. Даводзячы гэта да агульнага ведаму, Цэнтральны Камітет дапамогі галадуючым пры Усерасейскім Цэнтральным Выканаўчым Камітэце выказвае грамадзяніну Ургарду падзяку.

Розныя весткі.

Фінляндзкая дэлегацыя ў Варшаву.

ЛЕНДАН. 14. 9. Нансен у гутарцы з карэспандэнтам, з прычыны апошняй ноты Чычэрына, між іншым заявіў: „Адмаўленьне Масскоўскага правіцельства дужа не жадана. Як я мысьлю, Савецкая ўлада, відаць, спаслася. З гэтае прычыны разьезды па галодных мясцох гэтай вялікай кампаніі, як 30 сяброў анкетнай камісіі з іх сэкратарамі і іншым пэрсоналам, было б дужа цяжкімі пры істнуючых умовах. Гэтыя разьезды павялі б толькі да лішняй мінтрэгі падачы дапамогі у такі час, калі дораг кожны дзень. Анкета зусім не пасунула б наперад справу дапамогі, а толькі паставіла б зусім непажаданыя вымаганьні палітычнага характару“. Нансен заявіў, што ён прыпоў да поўнай згоды з Савецкім урадам. Яго згода дужа трывалая.

Прыяжджаюць.

З Будапэшту адпраўляюцца ў Расею 400 звольненных сацыялістаў і камуністаў з прычыны абмену ваенна-палоннымі.

Пад панскай пятою.

Барацьба з беларускай школай у Польшчы.

Віленская газета „Вольнае слова“ у сваім нумары ад 9 гэтага верасьня г. г. паведамляе аб стане вішчэ беларускіх школ у Польшчы. Між іншым яна піша:

Не можна на'т сабе прадставіць гэтага, што робіць школьны інспэктар у барацьбе з беларускімі школамі. Гэты чалавек дзеі здзіўку над беларускімі школамі і абіцяе іх на трэбуе замкнуці вазмі нагодзі. Пад іх пастар на бранцца ні грамадзе, ні мовою, ні пастаўшаньнямі, ні спадмаяцем, нічым—дзе яго ўсё добра, каб вадушыць беларускія школы ў Вялікапольскім павеце. Ма вінавацім школьнага інспэктара Вялікапольскага павету ў нежайшкаваных праступленьнях і дамагаемся ад польскае ўлады выдалення і пакараньня.

1) Пан інспэктар фільшына, ня маючы на гэта ніякага права, заявіўшы беларускім вучыцялём і інш., што беларускія школы ў Вялікапольскім павеце забароненыя, вазначыцца забароненыя як вучыць у вялікапольскіх школах, так і вучыць новых. Польскі Сойм і Урад гэткага закону і загаду ня выдалі, дык значыцца гэта мана польскага ўрадніка, пасягаўдзенага шырыць прасьвету, біта розьніцы ва цывілізацыі.

2) П. інспэктар заявіў, што могуць быць толькі прыватныя беларускія школы і што ў гэтакіх школах маюць права вучыць беларускія вучыцялі, якія маюць званьне вучыцеля. Калі-ж з многіх мясцовасьцяў пачалі прасіць у інспэктара дазволеньня адчыніць беларускія прыватныя школы і шмат зьявіліся беларускіх вучыцялёў, маючых званьне вучыцеля, якія хацелі вучыць у беларускіх прыватных школах, п. інспэктар заявіў, што маюць права толькі тыя вучыць у прыватных школах, якія скончылі ня менш 6 кл. сярэдняе школы. Калі ж зьяўляюцца вучыцялі з 6 клясай і вышэйшай адукацыяй, то ім школьны інспэктар катэгорычна заяўляе, што і прыватныя беларускія школы забароненыя.

Адначасна п. інспэктар прапануе беларускім вучыцялём, баз розьніцы адукацыі, згадзіцца быць вучыцялямі ў польскіх школах. Каб напалохаць, старор заваць беларускае вучыцельства п. інспэктар заяўляе што ўсюды, дзе былі беларускія школы, там цяпер адчынены школы польскі і пр пануе беларускім вучыцялём вучыць у гэтых польскіх школах, абяцаючы дазволіць ад чатырох да шасьцёх гадзін у тыдзень мець беларускіх. Запраўды-ж вышла-б так, што беларускія вучыцялі паздчынялі-б польскія школы, ў якіх, каб прыцягнуць беларускіх дзяцей, часова ім дазволена было-б вучыць самым і мець гэныя некалькі беларускіх гадзін у тыдзень.

Гэты-ж самы інспэктар у польскія школы назначае вучыцялёў з надта малою адукацыяй. Гэтак, у вёску Сакоўшчыну, Вішнеўскае вол. назначаны Гардынец, што скончыў толькі 2 (дзьве) клясы вышэйшай пачатковае школы, у м. Вішневе кір ўніком школы, назначаны Зара, што скончыў толькі 4 клясы вышэйшае пачатковае школы у в. Ігнацова, Вішнеўскае вол. назначана вучыцелька дзяўчына з хатняй адукацыяй, у вадну з школ Бакшчанскае волосьці назначаны Кулак з двухкляснай адукацыяй.

Ня трэ на'т ужо казаць, што інспэктар нягодна і брыдка абражае беларусоў, уманяючы ўсім (у тай лічбе і вучыцялём) кінуць „chamski język“ і гарнуцца да „культурнага“ польскага. Прыкл. вуч. Алене Карнаух інспэктар сказаў „на што было ехаць на chłopskie курсы ў Вільню, калі ў Навагрудзкім ваяводзтве было шмат польскіх курсаў“.

Насьленьне дзеці дамагаецца беларускіх школ.

У тых мясцовасьцях, дзе насьленьне мякасьвядомае, каб яно не дамагалася беларускае школы, інспэктар заўважае, што заместа беларускіх, будуць школы расейскія польскія.

Яшчэ аб моладзі.

У № 203 „Савецкая Беларусь“ надрукавана стаття А. Зьніч аб тым, што ў нас на Беларусі Камуністычны Саюз Моладзі ня мае гістарычнага права на жыцьцё, што гэтыя саюзы нават дрэнны для беларускага адраджэньня, што ў іх мова чужая, дзякуючы чаму іх ніхто не разумее, як быццам там гаворыць кітайску.

Як відаць, сябар А. Зьніч зусім ня ведае, які характар павінна мець наогул культурнае адраджэньне, які палітычны напрамак павінна мець у культурнай працы пралетарская і сялянская моладзь у часе пралетарскай рэвалюцыі; чым у нас зьяўляецца беларуская мова, і якой палітыкі трымаецца К. П. Б., ці наогул Р. К. П. у адносінах да нацыянальнага пытаньня. Каб дабродзій усё гэта ведаў, то не сказаў бы такога глупства, што К. С. М. за тым і ні пашыраюцца, што іх мовы зусім не разумеюць; і ў канцы сваей стаття голасна не абвіў бы, што: „толькі шырокая беспартыйная культурная праца ў роднай мове“ давядзе моладзь „да лепшага жыцьця“.

Пагледзім што гэта за беспартыйнасьць наогул, бо з гэтым словам нам прыходзіцца часта сустракацца. Перш усяго: ці ёсьць беспартыйнасьць а калі ёсьць, так ці прагрэсыўны гэта фактар?

У страшэнна цяжкай барацьбе працы з капіталам, сьвета з цемрай, свабоды з уціскам ці можа хто быць раўнадушна пасярэдзіне? Хто можа сказаць што яму ўсёроўна: ці свабода для народа, ці уціск; ці сьвет для яго, ці цемра; ці пабеда ўсямірнага пралетарыяту, ці пабеда ўсямірнай буржуазіі? Хто можа гэта сказаць? А ну дабродзій Зьніч.

Гэта можа сказаць толькі той хто акрамя (мякка кажучы), духоўнага балота, і волі ў сабе ня мае. Ці як той асёл, які стаяў паміж двох роўных стагоў сена і здох з голаду, ня ведаючы з якога лепей пачаць есьці (ці ні такі беспартыйны сябар Зьніч). Усякі чалавек, у якога ёсьць хоць крупіна розуму, скажа з якога боку ён стаіць, дзе яму выгадна.

У нас было шмат усялякіх контр-рэвалюцыйных наступаў, а ў 21 г. самы язуіцкі з усіх—гэта беспартыйнасьць. Каты-кравапійцы: памешчыкі, буржуазія, генэралы з сваімі лёкаямі зрабіліся беспартыйнымі (ці ні такі беспартыйны сябар Зьніч? цікава ведаць). А дзеле чаго? Дзеле таго, каб скінуць галаву рэвалюцыі—К. Партыі, бо яны добра ведалі дзе сіла, скінуўшы якую можна будзе ўсіх пралетарыяў, беднату, зноў лёгка ўсадзіць у сапраўдзі ужо зусім беспартыйную цэмру, бапота, адкуль няма выхаду, куды і промень сонца не заглянне, дзе забітыя працай будуць капашыцца, як тыя чэрві на шчасьцем, цёмныя людзі—рабы. (Ці ні гэта ідэал сябра Зьніча.)

Рэвалюцыйная моладзь. Пагледзіце, якая гэта беспартыйнасьць, ці можна з ёю ісьці па шырокаму шляху ўперад да гістарычнага прагрэсу, ці можна з ёю здабыць шчасьце народу?

Культурная праца на вёсцы, як усюды і заўсёды была і ёсьць партыйная палітычная. У старыя царскія часы ўсялякімі спосабамі рабілі ўсё магчымае, каб не даць асьветы народу, бо угнятацелі справідлова бачылі сваю гібель у народнай асьвеце. Ці гэта ня ёсьць беспартыйнасьць? Цяпер ці можна пашыраць сярод народу асьвету не паказываючы, хто яго палітычны, эканамічны і культурны вораг, непаказываючы як збавіцца яму ад гэтага ворага. Што можа сказаць проціў гэтага сябар . . . . . ?

Мо скажа ён, што ня праўда і тое, што ў кожнай песьні, у кожнай п'есе павінна гаварыцца гэта, што ў кожнай грамадзянскай навуцы ніяк не абойдзешся без палітыкі, без партыйнасьці, што ўся культурная праца тагды культурная, калі вядзе да шчасьця народу, да зьніштажэньня эканамічнага, палітычнага і культурнага ўціску—ці гэта палітычна, ці гэтага і толькі гэтага не дабіваецца камуністычная партыя і кам. саюз моладзі.

Той, хто хоча справідлова працаваць на карысьць культурнага адраджэньня Беларусі, без палітыкі не абойдзецца.

(Папытайце сябар Зьніч ўсякага адраджэнца, хай ён па совесьці скажа, ці не вядзе ён якой палітыкі, ці не прылучаецца ён да якой партыі і вы пачуеце адказ, што ўсякі вядзе палітыку і прылучаецца да той, ці іншай партыі).

Хто хоча пачаць свае сілы на карысьць Бацькаўшчыны, той павінен залічыцца у К. П. Б. ці у К. С. М. хто хоць трохі рэвалюцыйны, хоць трохі хоча лепшай будучыны для працоўнага народу (вядома не для паноў, капіталістаў), той павінен ісьці у К. П. Б. ці у К. С. М.

У К. С. М. моладзь вучыцца барацьбе за працоўныя ідэалы, у К. С. М. выковываюць свае сілы новыя маладыя байцы. Толькі адзін шлях да прагрэсу—цераз камуністычную партыю, якая апна праз усе сапраўдныя давядзе да сацыялізму.

Нечага глядзець на тое, што там мова незразумелая; а я пытаю сябра Зьніч чаму яна там не зразумелая; а вось чаму: бо вы „беспартыйныя“ робіце ўсялякія перашкоды беларускай моладзі, каб яна толькі не арганізавала К. С. М. Бо вам „беспартыйным“ беларускія К. С. М. усёроўна, што нож востры; бо вы на кожным кроку правацыруеце іх; і што ж зробіш калі у К. С. М. арганізуецца моладзь гораду, расейская. Калі будуць К. С. М. беларускія, тагды і мова іх будзе беларускай, зразумелай для ўсіх. Няўжо вы сябар Зьніч ня зразумелі, што трэба зваць рэвалюцыйную моладзь беларускую ў К. С. М., тагды толькі апошнія будуць беларускімі.

Рунь

14|IX 21 г.

Зьнішчэньне бандытызму.

Па прыкладу Эсманцаў

(с. Броды, Ігуменскага павету.)

На беспартыйнай канфэрэнцыі Брожацкай воласьці пастаноўлена: „Саве кая ўлада, як улада працоўных, запраўды будуе жыцьцё ў іх карысьці. Вайна і бандытызм давялі ўсю нашу гаспадарку і сялянства да бедкасьці. Шляхам агульнай працы, мы дасягнем да адрадженьня нашай гаспадаркі. Палітыку Савецкай улады цалком упазнаем і да ўсіх устаноў зьвяртаемся, маглядаць, адзін за адным і над усей працай ў карысьці працоўных. Проч расхлюбанасьць, скурніцтва, бандытаў і дезэртыраў. Нехай жыве праца сялянина наўкол яго саветаў. Па прыкладу сялян Эсманскай воласьці выдаваць усіх бандытаў для адпачыньня іх над суд."

Банда Жыцінскай воласьці.

Рэўвэнтрыбунал Заходняга фронту пры Нікай стрэлковай дывізіі разгледзеў справу па абвінавачваньню гр-н Цярэньцева, Тэуншы і Букіна ў бандытызьме, Шырокавай, Лук'янчай, Маргуна, Гендэльсона, Лішчынскага Кашкова, Камкова-й Бабчыка, Апанасава, Кучынскага і Ранцава ў дапамозе бандытам. Цярэньцеў і Букін, будучы ўгалоўнымі праступнікамі, хаваючыся ў лесе, спатыкаліся з Шырокавым Хведарам і сталі займацца ўзброеным рабаваньнем. Яны ўвайшлі ў банду, якая была ў Жыцінскай воласьці. Пасьля двух тыдняў, набраўшы сабе 6 чалавек, бандыты адчайшлі ад Жыцінскай банды і сталі рабіць узброеныя рабаваньні і забойствы. У адной перастрэлцы з чырвонымі атрадам, Шырокаў быў забіт. Трушка ўвайшоў у банду, каб на мяцца, але ў рабаваньні ўдзелу не прыймаў. Шырокава і Лук'янава трымалі цесную сувязь з бандытамі, дастаўляючі ім харчы і прыймалі ад іх нарабаваную маемасьць. Маргун паказаў мейсце для рабаваньняў. Гендэльсон дапамагаў гэтай бандзе і іншым у отраве куплі і пераправы крадзеных коняў праз граніцу ў Польшчу. Камковы Яхім і Мацвейня, будучы родными кіраўніка банды Шырокава рабілі дапамогу бандзе, дастаўляючі ім харчы, за што адтрымівалі ў падзяку рэчы.

Трыбунал прыгаварыў Цярэньцева Ахрэма, Букіна Піліпа, Шырокаву Акуліну, Лук'янаву Ульяну і Гендэльсона Ногу, як ворагаў працоўнага люду да вышэйшай кары—расстрэлу. Камковых Яхіма і Мацвейню з усей сямёй высялілі з абшараў Рэспублікі, лічучы кару для іх умоўнай. Трушка і Лішчынскага ліквідавалі свабоды на 3 гады. Рэшта трое апраўданы.

Бандытам і правакатарам сьмерць

На адчыненым пасяджэньні суда ваенны аддзел Рэвалюцыйнага трыбуналу Беларусі прыгаварыў грамадзянін Шыдлоўскі з сяла Цімкавіцкай воп., Слуцкага павету, за прыняцьце ўдзелу ў бандзе пазбе на м. Капыль, пасьля паступіўшага на службу ў Рабочую Сацыяльную Забясьпеку, падрываючы гэтым Савецкую ўладу, да вышэйшай кары—расстрэлу.

Рэўвэнтрыбунал Беларусі прыгаварыў к расстрэлу грамадзянина м. Вішны, Слуцкага павету Бурмака Іхілю, які раздаў, мяючыся ў яго 4 стрэльбы бандытам Чыгіру, Воўку і іншым, прымусіў свайго сына Яку йсьці ў разьведку для падтрыманьня сувязі з бандытамі, а гэтак сама праводзіць прыйшоўшага да яго бандыта.

Колькі слоў аб пастаноўцы спэктакляў на весцы.

4 цьвертага верасьня г. г. ў мабітку Дукоры Ігуменскага павету адбыўся чарговы спэктакль на карысьць галадуючых Паволжа. Спэктакль быў пастаўлены супольнымі сіламі стаячага тут брыггошпіталя і мяйсцовым артыстамі—любіцелямі з мэтай стаўніцтва і вучняў. Дзякуючы сьвяточнаму вечару і зацікавіўшай нарадзе фішы, як я абвячала канцэрт, дух вы аркестр, драму: „Птенц последнего слета" Пісемскага і ў канцы скокі, народу с бралася столькі, што досі вялікая саля тэатру не змагла змясьціць усіх жадаючых пабачыць спэктакль. Білеты так сама былі ўсе распраданы і іх для многіх не хапіла. Перад спэктаклем адбыўся мітынг, на кім выступаючыя прамоўцы абрысовывалі жыцьцё Паволжа і запрашалі с браўшыхся дапамагчы чым можна. З боку жаданьня атрымаць maksimum карысьці дзеля галадуючых, спэктакль удаўся як ня трэба лепей. Але ў гэтым спэктаклі, як і другіх р ней быўшых пастановах, цікавіць іншае пытаньне—пытаньне культурна гуманітарнага ўплыву на салю са сцэны. Прыходзіцца адзначыць, што выбар п'ес дзеля пастановы на сцэне далек ад ідэалу. Артыстам, рэжысуры і загадчыку агітпроста, па дагульным кіраўніцтвам якога адбываюцца спэктаклі апошніх часоў, трэба больш прадумываць і з большай асьцярожнасьцю выбіраць той матар'ял, які маецца потым прападнесіцца публіцы. Такія пьесы як „Боевые Соколы", „Птенцы последняго слёта" і інш. саўсім ня прыгодны дзеля гэткових тэатраў. Лічыць магчыма, што падобныя п'есы ня прыгодны нават ні ла якай сцэны свайм матар'ялам. Што можа даць сялянству пьеса, у якой маюцца адбітак разрашчанага мешчанскі—арыстакратычнага грашовага сьвету, дзе бацькі жывуць з дачкамі, браты з сестрам? Дзе жонкі клапоцяцца толькі аб адным, каб не застацца без любоўнікаў і каб мець іх магчыма болей і часьцей, і калі жыцьцё пачне браць пляту, пачынаюць страляцца, страляць другіх? Што магчыма вынесьці харошага із сяк і слукачу сялянину пасьля такой духоўнай справы? Адну гідлівасьць і наогул поўнае неразуменьне таго, што бачылі выносяць яны ад гэтуль. Такія п'есы толькі і робяць дэмаралізуючы і развращаючы ўплыў на людзей. Яны ўяўляюць цалкам із старых буржуазных тэатраў, дзе сутая развращаная, з прытупленымі нервамі, буржуазія цешыла сябе рэжнымі цікавасьцямі і дрэнямі, пасьля свае „карыстнае" працы. Не гэта патрэбна ў рэвалюцыйныя часы. Тэатр павінен быць раней за ўсё шкодзей, дзе грамадзянства павінна ўчыцца прыгожымі жыцьцёвымі прыкладамі, дзе людзі павінны станавіцца больш адзінучлівымі, чутлівымі і добрымі. Тэатр павінен стаць новай царквой, якая б замяніла царквы з папамі, абразамі і зацямненьнямі самапачуцьця народнага. А у нас, пра тры гады Савецкай улады яшчэ не падумалася да таго, што ад патрэбных п'есаў акрамя кепства, лёгкай карысьці атрымаць не магчыма. Могуць сказаць, што каб больш дабіць усялякіх сродкаў дзеля падтрыманьня галадуючых, патрэбна ставіць дзіцячыя п'есы, каб на спэктаклі заклікаць больш народу. Скажу, што гэта саўсім не аргумэнт. Гэта не дае права развращаць і дэмаралізаваць са сцэны грамадзянства. Магчыма знайсьці шмат сталых і карысных п'ес, як новага рэвалюцыйнага рэпэртуару, так і старых дарэвалюцыйнага аўтараў. Так сама, пускацца на агульную ману, як апавешчаць аб канцэртах, скоках і іншых уцехах вечару і нічога з абяцанага не даць, гэта саўсім ня дзела сталых людзей. Гэтым толькі падрываецца вера ў аўтарытэт культурнага працоўніка перад селянствам і наогул грамадзянствам, у в аччу якога гэта старана павінна як раз стаяць досі высока, каб была магчымасьць ўлі яць на массу. Нарэшце скажу, што пра артыстаў за малымі выключэньнямі была надта прыемнай, поўнай прадуманнасьці і шчырага характару. Роб ца надта шкода, што з такімі сіламі не выдецца тае дарагой культурнай працы, якая так патрэбна на вёсцы Беларусі і як я займаюцца перажовываньнем старога буржуазнага хламу, ад якога атрымліваюцца толькі перашкоды.

Я Ш

Па незапраўдным шляху.

У № 203 „Савецкай Беларусі" выдрукаваны артыкул „Сапраўдны шлях". Ад усяго артыкулу так і пахне жаданьнем усе св е недахваты ўзваліць на другіх. Аўтар артыкулу толькі і стараецца д'ка заць, што камуністычны саюз моладзі не гадзіцца і дакав'ўшы гэта, супакойваецца. Пабачым, ці так жа гэта.

У артыкуле „Сапраўдны шлях" пытаньне кіруецца к таму, што патрэбней усяго беларускай моладзі—камуністычны саюз моладзі ці беспартыйныя культурна—асьветныя гурткі.

Аўтар адкідвае, што ў гурткох пануе нацыёналізм. Але як адкідвае? Ён кажа, што па статуту прымаецца ў гэтыя гурткі моладзь усіх нацыёнальнасьцяў. Але статут можа быць статутам. Гэта толькі прыгожа напісаная папера, а калі запраўды паб'чыць на гурткі, дык у іх усё т к і дыхае нацыёналізмам.

Нельга апраўдываецца тым, што нацыёналізм есьць і ў камуністычным саюзе моладзі, як гэта робіць аўтар артыкулу „Сапраўдны шлях".

Камуністычны саюз моладзі—арганізацыя, куды ўваходзіць моладзь бяз розьніцы нацыяў і размяваецца там на тэй мове, на якой разумее і гаворыць. Гэта і ёсьць галоўнае. Гэта павінна ведаць тая бел руская моладзь, якая яшчэ знаходзіцца пад уплывам нацыёналістаў.

Далей—пытаньне аб інтэлігэнцыі. Трэба сказаць адкрыта, што ў культурна—асьветных гурткох кіруе інтэлігэнцыя. Але гэта яшчэ ня так страшна. Галоўнае тое, што гэта інтэлігэнцыя не дае падняцца і выявіць сябе звычайна й грамадзтэ моладзі.

У камуністычны саюз моладзі так сама прымаецца інтэлігэнцыя. Яна прыцягваецца да асьветнай працы і толькі ў працэсе працы яна зжываецца з рэштай грамады і робіцца запраўды карыснымі сябрамі камуністычнай арганізацыі і губляе тыя нядобрыя адзнакі, якія мае і якія адносяцца толькі да інтэлігэнцыі.

У культурна—асьветных гурткох танцуюць. Гэта праўда, але аўтар артыкулу „Сапраўды шлях" кажа, што і ў камуністычным саюзе моладзі так сама танцуюць. Гэта не адгаворка.

Калі ў нас стаяла пытаньне аб зборы харчовага падатку, аб самым харчовым падатку—ва ўсіх ячэйках камуністычнага саюзу моладзі добра разьбіралася гэтае пытаньне. У справе змаганьня з бандытызмам—ячэйкі Камуністычнага саюзу моладзі прымалі самы гарачы ўдзел: лавілі бандытаў, выдавалі іх і г. д. Дапамогу галадуючым, агітацыю паміж сялянства вялі ячэйкі Камуністычнага Саюзу моладзі. Адцельныя ячэйкі наладжвалі зборы на карысьць галадуючых, езьдзілі па вёсках і вялі агітацыю.

А што ж у гэты час рабілі культурна асьветныя гурткі? Яны танцавалі і весяліліся, яны ставілі спэктаклі.

Камуністычны Саюз моладзі вядзе шырокую працу паміж беспартыйнай моладзі, культурна асьветныя ж гурткі замыкаюцца ў сваім цесным кругу.

Розьніца паміж Камуністычным саюзам моладзі і культурна-асьветнымі гуртками тая, што, першая—гэта арганізацыя, якая ня ўхіляюцца пытаньняў, якія ставіць само жыцьцё. Яны іх разьбіраюць, ва ўсім, што робіцца наўкола нас, яны прымаюць удзел, а культурныя гурткі нічога, апрача культуры, ведаць не жадаюць. Гэта арганізацыя жыцьцёвая. Танцамі і спэктаклямі доўга не пражывеш.

Чаму культурна-асьветныя гурткі стаяць за „беспартыйнасьць?" А з тэй прычыны, што яны баяцца палітыкі, баяцца жыцьця. Запраўды ж тыя кіраўнікі, якія крычаць за „беспартыйнасьць"—самі выяўляюцца не беспартыйнымі, а скрытымі контр-рэвалюцыянэрамі ці мацьёналістамі.

Абсалютнай беспартыйнасьці няма. Калі не спачуваеш Савецкай уладзе, дык ты вораг яе і спачуваеш контр-рэвалюцыі. Вось так стаіць пытаньне.

Камуністычны саюз моладзі не баіцца жыцьця. Ён прымае ўдзел ва ўсім тым, чаго вымагае жыцьцё. З гэтае прычыны ён і ўзмацняецца, у гэтым і яго жыцьцё. К яму і павінна йсьці беларуская моладзь.

М. Шайман.

Вершы Я. Журбы.

Чырвонаму аратаю.

Гэй, араты, з песьняй волі,
З асьвятлёнаю душой
Выяжджай хутчэй у поля
З бараною і з сахой!
Трэба упарцей змагацца,
Каб ўскарміць працоўны сьвет;
У супольнай творчай працы
Й ты пакінуць мусіш сьлед.
Знай, што хлеба многа трэба
Людзям нашым працаўным,
Дык працуй-жа, каб нам хлеба
Цэлы год хапіла ўсім!
Хоць тут глеба неўрадліва,
Дык затое сілы шмат,—
Закрасуе наша ніва.
Дык працуй жа шчыра брат!
Знай, араты вольнай нівы,—
Цемру ночы мы змаглі,
Выйшлі ўжо на шлях шчасьлівы
Ладзіць долю на зямлі.
Дык, чырвоны наш араты,
Шчасьце краю й ты будуй!
Ты зямлёй цяпер багаты,
Толькі шчыра, знай, працуй;
З песьняй працы, з песьняй волі;
З асьвятлёнаю душой
Выяжджай хутчэй у поля
З бараною і з сахой!

Тымн працы.

Асьвятліў скрозь абшар
Волі сьветлай прамень—
І узьняўся наш люд,
Прывітае свой дзень.
Цяжар злых ланцугоў
У жыцьці згінуў навек.
У царства волі сьвятой
Увайшоў чалавек.
Працоўнік—беларус,
Прад табой вольны шлях:
Сваяры—ж ты ўсю моц—
Працы шмат на полях.
Гэй за працу хутчэй.
У поля ўсе—як адзін!
Беларус ад вякоў
Цяжкай працы быў сын.
Шчыра праца—заклад
Сьветлай долі тваей;
У шчырай працы сваё
Знойдзеш шч сьце хутчэй.
Дык, безладзьдзе, гэй проч:
Праца дружная йдзе;
Проч і смутак і страх,
Вольны шлях грамадзе!
Вольнай працы мы ўсе
Запяём гымн—прывет
І да працы сьвятой
Будзем зваць цэлы сьвет!

З чужыны.

З сьветлай волай, край мой родны!
Прывітаньне шлю табе,
Шлю з далёкае краіны,
Дзе так сумна мне.
Толькі ўспомніў цябе, краю,
Я у чужыне—
І забілась сэрца моцна,
Радасна ў мяне,—
Што ачнулася старонка,
Мрак дзе панаваў,
Што народ заварушыўся,
Голас свой падаў;
Што ён скінуў путы рабства
І к сьвятлу ідзе,
Гымны волі, гымны працы
Весела пяе;
Што ў руках трымае моцна
Свой чырвоны сьцяг
І рухае цьвёрдым крокам
Ён на новы шлях..
Хай жа хутка йдуць грамадай
Сейбіты твае
І хідаюць жменяй поўнай
Зерняты свае,
Хай наденьне ў вольным краю
Дасьць свой моцны плён;
Хай узрастае край мой мілы,
Хай красуе ён!
Во і ўсе маё жыцьцёвае,
Што я шлю табе,
Шлю з далёкае краіны,
Дзе так сумна мне.

Хто мы?

Мы з тых, каго вы так чакалі
З ня дзеяй, ўцехай і любоўю;
Сюды прышлі з чырвонай далі,
Акрэты пылам, потам, кроўю.

Ня чуем ў працы змярдзваньня.
Мы—сіла гр мады бязьлікай,
Ваякі працы і змаг ньня,
Сябры камуны мы вялікай.

Тварцы ўсіх фабрык і заводаў,
Спрадвеку б'ёмся мы за волю.
Мы—ворагі ліхіх прыгодаў;
Нясём ў край мы сьветлу долю.

Прышлі—й магутным рукамі
Будуем тут палац вялікі.
Змагац а хто пасьмее з намі?
Хаўрус наш моцны і бязьлікі!

Хоць шлях наш каменісты й цяжкі,
Мы верым ў працу і змаганьне,
Ўзьнімаем цёнгля молат важкі,
Шлём новай долі прывіт н не.

У барацьбе з вялікай бурай
Мы моц сваю загартавалі.
Ня грозны нам цяпер віхуры:
Як волат—мы магутны сталі!

Мы клічам ўсіх, ў каго сумленьне
Яшчэ хоць малай іскрай зьяе:
Да працы з намі!. Йдзём з нат
хненьнем!.
Ад ўнукаў слава нас чакае.

РАБОЧАМУ.

Гэй, рабочы не лядачы,
Шчыра ты працуй,
Час прышоў для нас гарачы,—
Краю долю куй!
Селянін разам з табою
Зьнішчыць занапад;
Йдзіце-ж к працы грамадою,—
Жыцьцё пойдзе ў лад.
Не дарэмна серп і молат
Наш чырвоны гэрб:
Ў гэты час ты будзь, як волат,
Селянін жа серп.
І насу, і плуг працоўны
Ўпарта пусьце ў ход;
Тады прыйдзе бязумоўна
Да нас плённы год.
Гэтак хутка на шырокі
Выйдзем мы на шлях
Павяліч жа свае крокі,
Вышэй працы сьцяг!
Бо у згодзе толькі працы
Ўсіх збавеньне нас;
Будзе край наш красавіцца,
Прыйдзе сьветлы час..
Дык сумленна ты і згодна
За станком працуй,
Беларусі сваёй роднай
Шчасьце долю куй!

Рыхтуйцеся да „Тыдню дапамогі галадуючым!“

У Савецкай Фэдэрацыі.

Контр-рэвалюцыйная справа

7-га верасьня на 81-ай вярсьце Паўднёва-Заходняй чыгункі між Кажанкай і Фастовым сасокочіў з рэйкаў паравоз, а за ім адзін за другім і вагоны. На рэйках засталося толькі 12 вагонаў. 47 вагонаў разьбілася ў шчэпкі. Расьсьледаваньне паказала, што крушэньне было падгатавана—нехта разабраў дарогу. Расьсьледаваньне цягнецца. Злачынцаў шукаюць.

Зьнішчаньне Пятлюраўскага заговору.

Калегія Кіеўскай губэрнскай надзвычайнай камісіі разгледала справу па абвінавачаньню сяброў і ўдзельнікаў Усеўкраінскага Паўстанцкага Камітэту; удзельнікаў гарадзкой войсковай арганізацыі, удзельнікаў войсковай арганізацыі сечавых стрэльцоў і ўдзельнікаў баявой групы атамана Блавэрбеко. У цяжкіх злачынствах супроць Украінскай Савецкай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі з мэтай зьнішчэньня рабоча-сялянскай улады і адкідваньня Украінскай Народнай Рэспублікі супроць волі рабочых і сялян.

На здрадніцкую палітыку супроць украінскага народу, дзе мецаны на ўвазе перадусім Украінцы пад прыгон польскіх паноў і дзяржаў Антанты, калегія кіеўскай гарадзкой надзвычайнай камісіі ўтвердзіла пастанову: за прыналежнасьць удзелу ў арганізацыі і кіраўніцтва паўстанцкай працай на абшарах Савецкай Украіны 39 пятлюраўцаў вагаталу расстрэляць, у ліку трыццаці чатырох тарэмных на 5 гадоў прасуджаны 18 асоб, на 2 гады прыгавораны 38 асоб і на адзін год—4 асобы.

Дапамога галодным дзецям.

У Сімбірску адчынены прыёмчныя хаты, дзе знаходзіцца каля 700 дзяцей галадуючых. Павопж. Адсюль дзеці накіроўваюцца ва ўраджайныя губерні. У Арле для прыяжджаючых з Паволжа дзяцей сьпецыяльна пераробляецца дварэц ахова здароўя дзяцей на 1000 чалавек. Прыяжджаючыя дзеці дызэнфэктуюцца, робіцца мэдыцынскі і псіхалёгічны агляд, разьмяркоўваюцца па вёськах, дзіцячых хатах і школах здаровыя дзеці перадаюцца губэрскім камісіям, якія накіроўваюць іх у паветы. У Пермскай губ. адчынен дзіцячы гарадок на 6 тысячаў дзецей.

Забастовачны рух.

Душаць.

РЫГА 14. 9. У Заходняй Віргініі войска разагнала і разброіла вуглякопаў, якія баставалі. Рабочыя са зброяй схаваліся ў горах і маюць на ўвазе аднавіць змаганьне, каб вывесьці войска.

Забастоўка ў Бэрліне.

З Бэрліну паведамляюць, што там выбухнула забастоўка рабочых электрычных і газавых заводаў пад эканамічнымі і палітычнымі лёзунгамі.

Што робіцца на Беларусі.

Дваццацідзённік для збору бульбы.

Слуцак, 18. 9. Адбылося рэшты рачэ пасяджэньне павятовага выканаўчага камітэту з прадстаўнікамі ад вольасных выканаўчых камітэтаў і рэвалюцыйных камітэтаў. Усяго прысутнічала каля 40 прадстаўнікоў. На павестку дня былі пастаўлены даклады павятовага ўпаўнаважанага камісіі аб мерах барацьбы з бандытызмам, павятовай харчовай камісіі аб харчовай працы, камендантскага аддзелу аб мерах барацьбы з бандытызмам. Пасяджэньне адбылося ў 1 г. і сорадзіна, як ніколі. Была прынята пастанова аб правядзеньні з 15 га па 30 верасьня дваццацідзённіка па збору бульбы, з абавязковым выкананьнем 85 процантаў.

Добры прыклад.

(В. Мікулічы, Ігуменскага павету)

Вёска Мікулічы Хутарскай вольасьці Ігуменскага павету абавязалася выканаць 100 проц. падатку на жыта і ўсе іншыя рачы да 10 верасьня.

Вёска прачынаецца.

(с. Любонічы, Бабруйскага павету)

За апошнія часы праца вёскавой камуністычнай ячэйкі Любоніцкай вольасьці значна павялічылася. Разам з камуністычнай ячэйкай мясцовага гарнізону былі выбраны больш адсталедныя камуністы. За адзін святочны дзень было пакідзана 7 мітынгаў у некалькіх вёсках. Сяляне ахвотна зьбіраюцца і ўважна слухаюць прамоўцаў. Уважаюцца пастановы аб найхутчэйшай дапамозе галадным і аб ашчадзе харчовага падатку. Адмагаліся прымаюцца пастановы аб дапамозе ўстановам якія змагаюцца з бандытамі.

У вёсцы Гацава Сяльбала утварыўся камуністычны саюз моладзі. Прыкмячаюцца вялікая праца усёй моладзі абъядноцца ў саюзы моладзі. Адчынена хата-чытальня, у якую наведваецца моладзь.

Пасьля агульнага сходу сяброў камуністычнага саюзу моладзі ўсе выйшлі на вуліцу і стройным радамі з рэвалюцыйнымі песьнямі прайшліся па вёсцы. Гэта ўрачыстасьць зрабіла на ўсіх моцнае ўражаньне. 19 жніўня адбыўся вялікі зьезд ячэек камуністычнага саюзу моладзі. Больш 6 такіх ячэек у нашай павятовай вёсцы.

Каапэратары.

(м. Цімкавічы, Слуцкага павету).

У нашым каапэратыве штось недобра. Сяляне да нашых каапэратараў адносяцца з вялікім недаверам, бо кажуць, на абмеры хлеб у іх мяшаецца імянь што, кожны дзень (ці не па біржавому курсу?), кажуць на вывешаны, як гета павінна быць. Дужа цікава, адна рэч—з сялян бярэць па 6 фунтаў з пуда на „ўсушку“. Нешто гета кажуць? Абавязкова патрэбна моладзь справу вашага каапэратыва прыцягнуўшы кудысь каго небудзь з партыйнага калектыву, каб сялане не сядзелі на каапэратарах, як на „чавярства спекулянтаў“, а як на сваё сп-ж вацца і вярнуцца, дзе шмат дзягі інтарэсы і сялянства і дзяржавы.

Канфэрэнцыя працоўнікаў асьветы.

(Ігумен).

У Ігуменіе окончылася канфэрэнцыя працоўнікаў асьветы. На канфэрэнцыі прымалі ўдзел делегаты ад усіх вольасьцей. Пасьля першага дакладу на беларускай мове аб вялікамічнай палітыцы і задачах працаўнікоў асьветы прыняты за груну тэзісы Меравоўскага і пасланы прывітальная тэлеграма Народнаму Камісару Асьветы Беларусі тав. Ігнатоўскаму. Быў высьлуханы там сама дакład на беларускай мове аб чынасьці адзелу народнае асьветы. Спрэчкі вяліся на абедзьвюх мовах. З дакладаў з місц в яўдася, што яны працуюць вялікую працу і прымаў у большай частцы сваёй гарачы ўдзел у агітацыйнай кампаніі. Адбыліся выбары на беларускую канфэрэнцыю і новага праўленьня павятовага аддзеленьня саюзу.

Пажар у Семежаве.

(Слуцак)

У мястэчку Семежаве па недагляду чырвонаармейцаў надзвычайна ўзарыўся пажар. Згарэла 82 хаты, 48 гумны. Пацярпела 51 самейства. Страты вялікія. Жыхарство вельмі пацярпела. Мясцовасьць усцягарэла, а гатак сама і хлеб. Вялікі вецер мяшаў тушэньню агню. Згарэў каапэратыў, дзе было каля 400 пуд. жыта, сабранага на карысьць галадуючых, а гатак самага 200 пудоў соці.

Інспэктар—сабатажнік.

Вольасны інспэктар Восьпускай вольасьці Зінгэр за невыпаўненьне загаду Барысаўскага Раённага Харчовага Камісара быў аддадзены пад суд Цэнтрыбуналу Заходняга фронту. Цэнтрыбунал прызнаў Зінгэра вінавым тым у тым, што адтрымаўшы загад Барысаўскага Райхарчкамісара выехаць на вольасьць для працы па харчовому налогу, ён не выканаў загаду, заявіўшы аб сваёй няздольнасьці да працы. Рэй жа Зінгэр ніяк х заяваў аб сваёй няздольнасьці да працы вольаснага інспэктара ў Раённую харчовую камісію не падаваў, улэўніваючы ўсіх у разуменьні сваёй с р в і выкананьні працы к тр ніну.

Прызнаўшы Зінгэра вінаватым у невыкананьні загаду і ў сабатажы, які выкаўся па застойнасьці працы па харчовому налогу ў с мы разгар увозу харчоў трыбунал прыгаварыў яго да адзінаго году прымусовай працы з лішэньнем права працаваць у харчовых установах у працягу пяці гадоў.

Захаваем чыстату.

(с. Цытва, Ігуменскага павету).

Зьезд сельскіх саветаў Цытвянскай вольасьці, выслухаўшы дакład сакратара аб змаганьні з вэраслымі хваробамі, ухвалі ў пастанову прыняць усе крокі дзеля захаваньня чыстаты ў кожным панадворку і будынку Цытвянскай вольасьці.

Папраўна школа.

(Ігумен).

З 1 га верасьня да 1-га кастрычніка абвешчаны ў Ігуменскім павеце месячнік дзеля папраўнай школы. Да справы арганізацыі ўсе зацікаўленыя ўстановы. Адбывецца агляд школьных будынкаў і памяшканьняў, выяўляецца патрэбная папраўка і прымаюцца крокі дзеля яе выкананьня.

„(Зорка)“

(Ігумен.)

У Ігуменіе утвараецца беларуская культурна-нацыянальны гурток „Зорка“. Большасьць з сяброў гурткі курсанты беларускіх настаўніцкіх курсаў. Гурток ставіць галоўнай сваёй мэтай стаяць на варце інтарэсаў культурнага адраджэньня Беларусі. Гурток ухваліў пастанову, што кожны сябар яго павінен, як у грамадзянстве, гатак і дома гутарыць пабеларуску дзеля таго, каб добра вывучыць мову і разпаўсюдзіць яе паміж іншых. Сёмамі гурка была пастаўлена п'еса „Пашыліся ў дурні“. Прысутныя на спэктаклі засталіся дужа здаволенымі. Прымячаецца вялікі запіс новых сяброў у гурток. Адчуваецца вялікі недахват літаратуры на беларускай мове.

Сярод польскіх сялян.

(м. Пуховічы Ігуменскага павету.)

У вёсцы Рэпішча, Пуховіцкай вольасьці, Ігуменскага павету на дні 6 жніўня, ці ня выканаў загаду, заявіўшы аб сваёй няздольнасьці да працы. Рэй жа Зінгэр ніяк х заяваў аб сваёй няздольнасьці да працы вольаснага інспэктара ў Раённую харчовую камісію не падаваў, улэўніваючы ўсіх у разуменьні сваёй с р в і выкананьні працы к тр ніну.

Прызнаўшы Зінгэра вінаватым у невыкананьні загаду і ў сабатажы, які выкаўся па застойнасьці працы па харчовому налогу ў с мы разгар увозу харчоў трыбунал прыгаварыў яго да адзінаго году прымусовай працы з лішэньнем права працаваць у харчовых установах у працягу пяці гадоў.

намоцнікам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту ў Слуцкім павеце, між іншым прыняў крокі к таму, каб дом селяніна ў Слуцку быў пастаўлен на належную вышыню. Гэтыя крокі далі добрыя вынікі. Дом селяніна, які да таго часу не паказываў ніякіх прыкметаў жыцьця, стаў разьвівацца, шырыцца і вытлікаць к с бе ўвагу прыяжджых сялян. Заліч ны загадчыкам дому тав. Клімаў, сам беларус, добра ведае беларускае сялянства з гор чнасьцю і шчырасьцю прыняўся за справу. Дом селяніна, як ячэ нядаўна пуставаў, ц пер ажыў, з варушыўся. Зьявілася раяля, на якой кожны дзень іграе спэцыяліст музыкант. Сяляне п ючы салодкую гарбату і слухаючы йгру на раялю, хваляць і выказваюць сваё здаволеньне. Там жа йграе грамафон. П д бор пласьцінак досіць добры, хаця невялікі. Досыць пласьцінкі з прамовамі нашых кіраўнікоў, н прыклад прамова т. Троцкага к сялянам. У перарывах паміж ігроў вядуцца гутарні з сялянамі аб значнасьці савецкай улады. У часе гутарак сяляне прызнаюцца, што цяпер жывецца куды лягчэй—ддасі па харчовому пад тку вядомую частк , а там можна на лішкі купіць у каапэр тыва ўсе п трэбныя рэчы.

У будучым часе маецца на ўвазе наладзіць кватэру для сялян, якім патр бна будзе начаваць у горадзе.

Па Менску.

Рыхтуйцеся да тыдню дапамогі галадуючым.

Гарадзкая камісія дапамогі галадуючым пастанавіла правесьці ў м. Менску з 2-г па 9-е кастрычніка г. г. тыдзень дапамогі.

Першае пасяджэньне новага гарадзкога савету.

У панядзелак 19 верасьня а 7 з паловай гадзіне вечары ў памяшканьні Дзяржаўнага тэатру адбудзецца пасяджэньне сяброў Менскага савету рабоч х і сялянскіх дэ ут т ў новага і старога складу. Парадак дня 1) Справаздача выканаўчага камітэту 2) Выбары в канаўчага камітэту і прэзыдыуму.

Для рабочых, сяброў прафэсыянальных саюзаў і ч рвонаармейцаў уход на пасяджэн не па білетах, якія будуць разьмяркованы пр з іх установы.

Сход камуністычн й фракцыі а 5-ай гадзіне ўвечары ў Клюбе Карла Маркса.

Штрафы за брудненьць.

Па пастанове сан'тарнай надзвычайнай камісіі за брудне трымань не панадворкаў аштрафаваны дамовыя камітэты гэтых будынкаў: Захараўская, 26, Маскоўская, № 11, Замкавая, № 19, Стара віленская, 22 і 2 на 50.000 рублёў кожны. Стара-віленская № 12 на 100 000 руб. і старшыня дамовага камітэту будынку № 2/36 на рагу Дзяржынскай і Маскоўскай вуліцы арыштаваны на 7 дзён.

Штрафы за прадажу сапсутых харчоў.

Па пастанове Надзвычайнай Санітарнай камісіі аштрафаваны за прадажу прэнных харчоў нічэйшыя грамадзяне: Доўгаў і Кавалоўская па 100.000 рублёў кожная, Арановіч і Гасьцановіч па 75 000 руб. кожны, Гун, Купцаў ч, Васюк, Я коў і Сямашка па 40 000 руб. і Шчыжкі Каборус па 20.000 руб.

Грамадзян н Кувьмецоў за прадажу сапсутай кубысы на 100 000 рублёў.

Крома № 5 на віжчым рынку на прадажу сапсутага масла на 100,000 руб. з напамінальнем аб зачыненьні. За прадажу харчоў не закрытымі ад мух грамадзяне Вяецкая, Вольт, Рудэрман, Касовер, Эрман, Ліўшыц, Дзвіговіч па 25 000 рублёў.

Адказны Рэдактар У. Ігнатоўскі.

6-я Савецкая друкарня (Інвалідаў) Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі Р В Ц Менск.